ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
5 01 2017 г.

*Камертон настрою*

# ЯК «ЗАЧАПІЦЬ» ПРАХОЖАГА,

## ці Ад чаго залежныя вулічныя музыкі

**Кожны з нас мноства разоў бачыў на вуліцах і ў пераходах маладых (і не вельмі) музыкантаў, выступленні якіх каму падаюцца рамантычнымі, каму найперш камерцыйнымі. Мы абышлі цэнтр сталіцы і распыталі некалькіх такіх творчых людзей: што прымушае іх даваць імправізаваныя канцэрты ў публічных месцах.**

***— Як даўно займаецеся музыкай?***

**Усевалад КАВАЛЕНКА:** — З 54 пражытых гадоў іграю на гітары ўжо 42. Упершыню ўзяў у рукі інструмент у 1972 годзе. Памятаю, як мы з аднакласнікам на балконе ў Брэсце выконвалі «Ролінг Стоўнз».

**Ксенія ЛІХАДЗЕДАВА:** — Мне зараз 26, а пачала займацца музыкай яшчэ ў школе. Пасля скончыла фартэпіяннае аддзяленне музычнага каледжа ў Віцебску. Таксама ўмею іграць на гітары, як і на флейце, аргане, цымбалах і варгане (гэта былі дадатковыя інструменты). Але патрэбна пастаянная практыка, каб атрымлівалася сапраўды добра. Цяпер выступаю ў тандэме з Усеваладам, ён іграе на гітары, я — на сінтэзатары.

**Аляксей АМЕЛЬКА:** — Займаюся з 16 гадоў (хлопцу зараз 29). Асвойваў гітару самастойна: сядзеў, напачатку пад касету падбіраў акорды. Калі расказваю, што нідзе музыцы не вучыўся, некаторыя здзіўляюцца. А я лічу, што ўсё магчыма, і, калі сапраўды хочаш, — даб'ешся.

**Раман СМЯШКОЎ:** — Я пачынаў таксама падлеткам, на гітары іграю з 15 гадоў. Ужо ў 19—20 у Гомелі іграў у пераходзе і ў прыгарадных цягніках. Пасля быў доўгі перапынак, і вось толькі каля года назад, у 31, я зноў узяўся за інструмент.

***— Што для вас вулічныя выступленні?***

**Усевалад КАВАЛЕНКА:** — Для мяне гэта ў меншай ступені камерцыя. Шчыра кажучы, такім чынам асабліва і не заробіш. Вось, напрыклад, мой сябра Нікерсан працуе ў Францыі на адным месцы ўжо 15 гадоў. Яго ведаюць жыхары горада. Мала таго, людзі прыходзяць спецыяльна, каб паслухаць, як ён іграе. Сябра за гэтыя гады ўжо вельмі добра вывучыў кан'юнктуру, так што меней чым 120 еўра за вечар працы не атрымлівае. Для Нікерсона гэта чыстая камерцыя.

**Аляксей АМЕЛЬКА:** — Для мяне такія імправізаваныя канцэрты — накшталт рэпетыцый перад выступленнем на прафесійнай сцэне. Спадзяюся, што калі-небудзь для мяне яны стануць своеасаблівым пропускам на яе. На вуліцы трэба іграць на самай справе класна, каб чалавек спыніўся цябе паслухаць. Вельмі цяжка «зачапіць» прахожага.

Сапраўдны вулічны музыка адпрацоўвае праграму, а не проста так іграе, што прыйдзе ў галаву. Дарэчы, мы ніколі не просім грошай у слухачоў. Але калі нехта думае, што ўсё так проста, то памыляецца. Каб хоць нешта зарабіць, трэба каб людзям падабалася тое, што ты робіш. Гэта пастаянная праца над сабой, прычым вельмі цяжкая.Таму я іграю не кожны дзень. Пасля якаснага выступлення даводзіцца дзень-два адпачываць.

***— Як звычайна рэагуюць слухачы?***

**Ксенія ЛІХАДЗЕДАВА:** — Залежыць ад узроўню культуры. Вельмі непрыемна, калі падыходзяць нападпітку і просяць выканаць штонебудзь непрыстойнае. Тады проста рукі апускаюцца. Але, паколькі я граю на вуліцы ўжо не першы год, у мяне выпрацаваўся своеасаблівы імунітэт.

**Усевалад КАВАЛЕНКА:** — Многа раз сутыкнуўшыся з імі, ты ўжо звыкаешся, ведаеш, як трэба паводзіць сябе, каб пазбегнуць канфлікту. На шчасце, гэта толькі малая частка людзей. У асноўным або праходзяць міма, або слухаюць, усміхаюцца (часам і не). Аднойчы быў выпадак, калі падышоў мужчына і кажа: «Я вам даў грошай толькі за тое, каб вы тут не ігралі».

Ёсць і тыя, хто прымае нас на ўра. Гэта ў асноўным тыя выпадкі, калі чалавек чуе песню, якую некалі любіў і слухаў з задавальненнем. А мы менавіта вось такія, можна сказаць класічныя, кампазіцыі і выконваем. Прахожых чапляе на эмацыянальным узроўні.

**Аляксей АМЕЛЬКА:** — Чым больш людзей спыняецца цябе паслухаць, тым цікавей працуецца. Чым больш энергіі аддаеш ты, тым больш да цябе вяртаецца ад кожнага слухача. Энергетыка вельмі акрыляе. Калі ты раз гэта адчуў, з'яўляецца нешта накшталт залежнасці, пасля хочацца працаваць яшчэ і яшчэ лепш.

Нават калі спыняецца адзін чалавек і ты бачыш, што яму шчыра падабаецца, хочацца выкладвацца на мільён працэнтаў. І не важна, колькі грошай яны табе кінуць у капялюш. Было і такое, што падыходзяць людзі і пытаюць: «Ці можна пастаяць і паслухаць, але ў мяне няма грошай». Вядома можна! Мы ніколі і ні з каго грошы не «трасём». Калі ёсць жаданне і магчымасць пакінуць невялікую суму, будзем удзячнымі. Калі не, то хопіць і ўсмешкі.

***— Чаго, на ваш погляд, не хапае вулічным музыкам?***


Фота Алены САЛАВЕЙ

Вулічныя музыкі пагадзіліся расказаць пра сябе.

**Раман СМЯШКОЎ:** — Дастаткова адвесці пару невялікіх пляцовак у месцах, аддаленых ад жылых дамоў, каб не перашкаджаць жыхарам. І каб пра іх ведалі мінчане. Гэта былі б такія своеасаблівыя свабодныя пляцоўкі: хто хоча, той іграе ці спявае. А людзі, калі ім падабаецца, слухаюць, апладзіруюць. Музыканты маглі б купіць ліцэнзію на такі род заняткаў за невялікія грошы і свабодна працаваць.

**Па каментарый мы звярнуліся да прэс-сакратара ГУУС Мінгарвыканкама Аляксандра ЛАСТОЎСКАГА:**

— З пункту гледжання правапарадку ў гэтым занятку няма нічога супрацьзаконнага, за выключэннем таго, што знаходжанне на закрытых пляцоўках можа ствараць пэўныя праблемы для прахожых (напрыклад, у пераходах), або калі музыканты дапускаюць абразлівыя прыставанні да людзей накшталт «дай грошыкаў, дай грошыкаў».

Перад міліцыяй стаіць першачарговая задача — ахоўваць грамадскі парадак і грамадзян. Напрыклад: ідзе маці з дзіцем па пераходзе, а там музыкант, так званы «вольны мастак» спявае непрыстойную песню. Ці спадабаецца вам такое? Што, малому вушы закрываць? І ці дапаможа гэта?

Галоўнае, да кожнай справы падыходзіць з розумам. Той жа вулічны музыкант павінен разумець, што можна рабіць, а чаго нельга, не выходзіць за маральна-этычныя рамкі, ведаць, што недапушчальна ў грамадстве. «Вольныя мастак» свабодны не ад абавязацельстваў перад грамадствам, а ад заключэння адносін з якім бы тое ні было калектывам. Але на яго распаўсюджваюцца ўсе тыя ж патрабаванні — прытрымлівацца прававых і маральна-этычных нормаў, якія склаліся ў грамадстве.

Увогуле, улады падтрымліваюць гэтую ініцыятыву ў рамках развіцця культуры: некалькі разоў у год праводзяцца розныя фестывалі, у тым ліку і пад эгідай Мінгарвыканкама. А ў летні перыяд амаль кожныя выхадныя праходзяць розныя мерапрыемствы з прыцягненнем музыкаў.

**Дар'я АРЭФ'ЕВА,
студэнтка VI курса
Інстытута журналістыкі БДУ.**

*Іголкай па скуры*

# МАМА, Я ХАЧУ ТАТУ́!

## Чаму адны бясконца «набіваюць» іх, а другія — выдаляюць?

**Татуіроўкі даўно перасталі асацыявацца толькі з афрыканскімі плямёнамі, турмой і арміяй. З аднолькавым поспехам можна заўважыць чарнільныя малюнкі пад скурай у школьніка, прадаўшчыцы ці афіснага супрацоўніка і ні кроплі гэтаму не здзівіцца. Таму сёння для таго, каб вылучыцца сярод іншых, невялікага малюнка, напрыклад, на руцэ ці назе ўжо недастаткова. Мы адшукалі маладых беларусаў, чые тату можна назваць незвычайнымі.**

### Сякеры на твары…

29-гадовы Дзмітрый Конанаў працуе тату-майстрам (маючы эканамічную адукацыю і адпрацаваўшы чатыры гады бухгалтарам). Ён з дзяцінства цікавіўся выяўленчым мастацтвам, а ўжо юнаком вырашыў нанесці малюнак на самога сябе — так у яго з'явілася першае тату.

— Сёння татуіроўкі пакрываюць прыкладна сорак працэнтаў майго цела. Кожная з іх мае пэўны сімвалізм для мяне, звязана з тымі ці іншымі падзеямі жыцця. Але гэта не такія канкрэтныя значэнні, як у «наколак» у крымінальным асяродку. Мастацкае тату хутчэй адлюстроўвае характар чалавека, яго інтарэсы, — тлумачыць хлопец. — Нягледзячы на тое, што ў мяне дванаццаць татуіровак, любімую з іх назваць не магу — гэта ўсё роўна, што выбіраць любімую руку! — кажа Дзмітрый і смяецца.

Першае, што кідаецца ў вочы, калі глядзіш на Дзіму, — выява дзвюх маленькіх скрыжаваных сякер на ягоным твары, якая з'яўляецца спрошчаным варыянтам родавага герба. Такое незвычайнае месца для татуіроўкі малады чалавек выбраў не проста так: гэта своеасаблівы выклік сучаснаму грамадству ці нават своеасаблівая спроба выйсці з вузкіх рамак соцыуму, дзе ўсе павінны выглядаць аднолькава, і стаць часткай андэграўнду.

— Наперадзе мяне чакаюць новыя малюнкі. Я жыву гэтым. А калі стану старым, буду шкадаваць толькі аб адным — што на целе скончылася месца!

### ...і знак задыяка на патыліцы

Якаву Пятрову 24 гады, і яго цела пакрываюць сямнаццаць татуіровак (дарэчы, лічылі мы іх падчас сустрэчы, бо дагэтуль хлопец нават не задумваўся пра колькасць).

— Першую зрабіў восем гадоў таму і доўга хаваў ад бацькоў — баяўся, што будуць сварыцца. Калі маці яе ўсё ж заўважыла, сказала толькі адно: «Навошта хаваў?» Напэўна, маім бацькам не падабаецца, што на мне столькі малюнкаў, але яны ўжо прызвычаіліся і нічога больш не кажуць. Затое староннія людзі любяць разглядваць маё цела, асабліва летам. У такія моманты я пераўтвараюся ў «галерэю».



Скрыжаваныя сякеры — спрошчаны варыянт родавага герба.

Нейкага асаблівага памкнення ці штуршка, які натхніў бы Якава на першую татуіроўку, не было. Спадабаўся малюнак — ён перавёў яго на цела. Цяпер, бывае, пачынаецца ўсё з ідэі, з якой хлопец ідзе да майстра, і яны разам вырашаюць, як увасобіць яе ў рэальнасць. Увогуле, тату хлопца нельга назваць сімвалічнымі, паколькі яны не звязаныя ні з падзеямі, ні з людзьмі.

Якаў не прытрымліваецца адзінага стылю ў татуіроўках: яго правая рука цалкам пакрытая малюнкамі ў японскіх матывах, на грудзях — постапакаліптычная тэма.

— Вось гэты мілы слонік, — Якаў паказвае на тыльны бок далоні, дзе красуецца выява жывёлы, — з'явіўся выпадкова. Аднойчы мне давялося патрапіць у кампанію, дзе быў тату-майстар. Мы разгаварыліся, і ён нечакана прапанаваў: «Хочаш яшчэ што-небудзь табе «наб'ём»?» Я згадзіўся. Праз некалькі гадзін у мяне было на адну татуіроўку больш.

Аднак самае цікавае тату Якава знаходзіцца на бачным месцы і пры гэтым не заўважна — на патыліцы пад валасамі. Першапачаткова малады чалавек не планаваў рабіць яго там.

— Я знайшоў цікавы эскіз — выява майго знака задыяка ў форме круга — і прыйшоў з ім у салон. Разам з майстрам мы вырашылі, што ідэальнае месца для такой татуіроўкі — патыліца. Ніякіх адрозненняў у нанясенні малюнка на галаву, скажам, ад цела не было. Адчуванні тыя ж самыя, можа, нават не так балюча, — гаворыць хлопец.

Татуіроўкі для Якава — гэта філасофія жыцця, культура, пэўная эстэтыка. У яго сяброў, дзяўчыны таксама ёсць тату. Хлопец працуе барыстам у кавярні, і, на яго думку, яны дапамагаюць прыцягваць увагу наведвальнікаў. На пытанне пра будучыню Якаў адразу ж адказвае: «У мяне яшчэ дзве «чыстыя» нагі! Карацей, «набіваць» ёсць на чым. Тут галоўнае, каб фантазія не падвяла».

### Надпіс пераўтварыўся ў пляму

Пакуль адны прыдумляюць эскізы для новых татуіровак, іншыя, наадварот, пазбаўляюцца іх. 22-гадовая Таццяна Лемяшэўская некалькі месяцаў хадзіла ў тату-салон на лазернае выдаленне малюнка. Працэдура гэтая не самая прыемная, каштуе даволі дорага, і для таго, каб поўнасцю прыбраць татуіроўку, спатрэбіліся не адзін-два сеансы.

— Зрабіла надпіс на руцэ тры гады таму. Спачатку мне ўсё падабалася, я разглядвала тату зблізку і не магла нарадавацца, бо майстар зрабіў усё так, як я хацела. Але праз некаторы час зразумела, што здалёк яна выглядае, як цёмная пляма. Да таго ж мне надакучыла тлумачыць усім, што азначаюць гэтыя літары з завітушкамі. А яшчэ, прыходзячы на пляж летам, я пачала звяртаць увагу, што татуіроўкі ёсць ледзь не ў кожнага другога, — расказвае Таццяна. — Ведаю, шмат людзей, якія таксама выдаляюць тату. Не бачу ў гэтым нічога незвычайнага, калі сучасныя тэхнічныя магчымасці дазваляюць гэта зрабіць.

Аднак дзяўчына не выключае, што ў будучыні зноў «наб'е» татуіроўку, толькі ўжо ў схаваным ад чужых вачэй месцы.

**Ганна КУРАК,
студэнтка V курса
Інстытута журналістыкі БДУ.**



Малюнкі на правай руцэ — гэта японскія матывы.